ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 66 (1335) | НЯДЗЕЛЯ, 22-га сакавіка 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . . 30 кап.
3 месяцы . . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . . 3 р. 60 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

Хваля протэстаў і абурэньняў

ХАРКАЎ, 20.— З розных раёнаў Украіны паступаюць весткі аб масавых протэстах працоўных супроць замаху на забойства гандлёвага прадстаўніка СССР у Японіі—тав. Анікіева. У сваіх рэзолюцыях рабочыя і колгасьнікі заяўляюць, што прыкладуць усе сілы да выкананьня плянаў соцыялістычнага будаўніцтва і гатовы даць адпор усім ворагам СССР.

Сутычка рабочых з нац соцыялістамі

БЭРЛІН, 20.—У ваколіцах Магдэбурга рэволюцыйныя рабочыя далі адпор атраду нацыянал-соцыялістых, прычым 6 нацыянал-соцыялістых цяжка паранены. Паліцыя арыштавала 27 рабочых. У горадзе Гельфюнген, пры крывавай сутычцы ў сувязі з нацыянал-соцыялістычным мітынгам, паранена 12 нацыянал-соцыялістых.

Юнкор—ударнік—організатар

Рэконструкцыйны пэрыод, пэрыод шпаркіх тэмпаў соцыялістычнага будаўніцтва высоўвае перад рабсель-корам-юнкорам зусім новыя задачы, прадстаўляе новыя запатрабаваньні.

Рашуча выкрываючы права-опортуністычную тэорыю і практыку, галоўную небясьпеку на гэтым этапе і „левыя“ загібы, за якімі-б шыльдамі яны ня хаваліся, друк у штодзённай барацьбе конкрэтнымі справамі мабілізуе масы на барацьбу за ленінскую лінію партыі.

Зараз мала быць фіксатарам. „Кожны рабселькор-ударнік, кожны ўдарнік—рабселькор“—такі лёзунг дня. Пролетарскі друк і рабселькораўскі рух увайшлі ў новы этап свайго разьвіцьця, калі перад імі, як ніколі пуката вызначаецца задача быць ня толькі масавым агітатарам і пропагандыстым, але і масавым організатарам. Гэта задача паступова знаходзіць сваё выразшэньне.

Організоўваемыя друкам мерапрыемствы і рэйды, перабудова ўсёй работы ў адпаведнасьці з галоўнымі задачамі дню—зьяўляюцца конкрэтным ажыцьцяўленьнем гэтай задачы. 10-годзьдзе „Чырвонай Зьмены“, адной з старэйшых комсамольскіх газэт, адзначаецца конкрэтнымі справамі ўпартай організатарскай дзейнасьці газэты і юнкораў.

Баявым паходам за спэцыялізацыю раёнаў, спэцыялізаванымі брыгадамі, організацыяй скразнога конвэйеру якасьці і радам іншых конкрэтных мерапрыемстваў, „Чырвоная Зьмена“ паказвае сваю ролю, як організатара мас у ажыцьцяўленьні задач партыі і ўлады.

Усебеларуская рабселькораўская нарада да якой зараз разгортваецца падрыхтоўка, павінна будзе праверыць працу і барацьбу нашага друку, выявіць наколькі ён мобілізуе масы і кіруе імі.

Падзеі апошніх дзён сьведчаць аб тым, што кіраўніцтва рабселькораўскага руху знаходзяцца ў нездавальняючым становішчы.

Зьмяшчаемыя сёньня матар'ялы дукорскай справы сьведчаць аб тым, што праца часткі рабселькораў, адарваная ад конкрэтных баявых спраў, без патрэбнай дапамогі і вучобы—сустракае вялікія цяжкасьці.

Карыстаючыся нелахопамі і слабасьцямі асобных рабселькораў, глушыцелі самакрытыкі імкнуцца апарочыць рабселькораў, задушыць праявы самакрытыкі і гэтым разьбіць асноўныя прынцыпы бальшавіцкага друку.

Рашуча змагаючыся з усякімі імкненьнямі душыць самакрытыку і цкаваць юнкораў неабходна і надалей змагацца за чыстату рабселькораўскіх і юнкораўскіх шэрагаў за юнкора-організатара, ударніка соцыялістычнай будоўлі.

БУРЖУАЗІІ І ЯЕ ПРЫСЛУЖНІКАМ НЕ СУПЫНІЦЬ НАРАСТАНЬНЕ РЭВОЛЮЦЫЙНАГА РУХУ

Комсамол Нямеччыны—баявы атрад КІМ'у пад сьцягам Комінтэрну больш рашуча будзе змагацца за канчатковую перамогу сусьветнай пролетарскай рэволюцыі

Соцыял-жандары забаранілі 6-ты зьлёт комсамолу Нямеччыны

На 5 красавіка 1931 году комсямолам Нямеччыны быў прызначан 6-ты ўсенямецкі зьлёт. Аднак, начальнік паліцыі, соцыял-фашысты Гржэзінскі, забараніў правесьці гэты зьлёт.

Эканомічны крызіс у Нямеччыне і ўздым рэволюцыйнага руху ўсё больш расхіствае яе капіталістычны лад. З кожным днём узьнімаецца рэволюцыйны рух рабочае клясы ў тым ліку і працоўнай моладзі. Рэволюцыйная настраёвасьць рабочай моладзі выяўляецца ў посьпехах комсамолу Нямеччыны, армія якога дасягнула 40 тысяч чалавек. Ня малым дасягненьнем у барацьбе комсамолу Нямеччыны зьяўляецца і тое, што комсамольская газэта „Юнгэ Гардэ“ пачынае выходзіць штодзённа.

Рост рэволюцыйнага руху пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, разам з посьпехамі ў клясавай барацьбе комсамолу—дзяржаўны апарат Нямеччыны, які ўсё больш фашызуецца імкнецца задушыць пры дапамозе тэрору, жорсткіх расправ і г. д.

Комсамол Нямеччыны не забыўся пра крывавую расправу над комсамольцамі ў час правядзеньня 5-га юнацкага дня ў мінулым годзе. Ахвяры гэтага дня, як і шматлікія ахвяры барацьбітоў за рэволюцыю, запісаны ў гісторыю комсамолу.

Буржуазія і яе служкі соцыял-фашыстыя рыхтуюць новыя расправы над рэволюцыйнымі рабочымі і моладзьдзю. Забарона гэтага дня зьяўляецца ня толькі забаронай выступленьня комсамолу і рэволюцыйнай моладзі Нямеччыны супроць буржуазіі і яе прыслужнікаў, але і забаронай выступленьняў рэволюцыйнай моладзі ў абарону СССР супроць хлусьні, якую вядуць капіталістыя пра Савецкі Саюз.

Гэта забарона, як і ўсякія спробы задушыць рэволюцыйны рух, выкліча яшчэ большую нянавісьць да буржуазіі, да ладу рабаўласьнікаў, яшчэ больш згуртуе комсамол Нямеччыны пад сьцягамі Комінтэрну і КІМ'у для барацьбы за перамогу сусьветнай пролетарскай рэволюцыі.

Комсамольцы Савецкага Саюзу адказваюць бурнымі протэстамі супроць забароны 6-га Ўсенямецкага зьлёту комсамолу. Яны адказваюць на гэта яшчэ большым узмацненьнем соцыялістычнага будаўніцтва ў Савецкім Саюзе, узмацненьнем інтэрнацыянальнай сувязі.

Менскія комсамольцы, якія ўступілі ў соцыялістычнае спаборніцтва з комсамолам Лейпцыгу, павінны яшчэ больш узмацніць работу па рэалізацыі соцыялістычнага дагавору паміж комсамольцамі Менску і Лейпцыгу.

„Аграрная“ конфэрэнцыя анты-савецкай пропаганды

ВЕНА, 20.—Заключнае пасяджаньне „аграрнай“ конфэрэнцыі, як і папярэднія, ярка выявіла яе антысавецкі характар. Аўстрыйскі дэлегат ня скрываючы антысавецкае лязо проектаваных мер, заявіў, што „расійская небясьпека ў канцы канцоў аб'яднае Сярэднюю Эўропу“. Прапанова гэтага дэлегата аб вывучэньні ўплыву СССР на гаспадарку Сярэдняй Эўропы перадана ў камісію. У вогуле конфэрэнцыя вылілася ў антысавецкую пропаганду буйных аграрыяў, у спробы стварыць эканомічны антысавецкі блёк у Эўропе.



„Казакі“ соцыял-фашыстага Плейснэра ў паходзе...

Паліцэйскі вобыск у памяшканьні друкарні комуністычнай газэты

БЭРЛІН, 20.—Паліцыя ў Эрфурце зрабіла вобыск у памяшканьні, дзе знаходзіцца друкарня мясцовай комуністычнай газэты, і ўсіх супрацоўнікаў камітэту партыі, рэдакцыі і друкарні ўвялі ў паліцэйпрэзыдыум. Па паведамленьні паліцыі вобыск зроблены ў сувязі з выкрыцьцём уяўнага складу зброі, які нібыта належаў компартыі.

Зьезд ударнікаў палёў колгасных

* На зьезд прыехала 400 дэлегатаў.

Іх асаблівасьці-не вясковая сьвітка, кажушок, сялянская барада, іх асаблівасьці ў тым, што яны перадавыя байцы за соцыялістычную перабудову вёскі, што яны зразумелі генеральную лінію партыі, і ня толькі зразумелі, а штодня праводзяць яе ў жыцьцё. Яны—гэта тыя сотні беднякоў, серадлякоў, аб якіх гаварыў тав. Сталін, што ня толькі мы, кваліфікаваныя бальшавікі, а сотні колгасьнікаў будуць самі агітаваць за колгасы“.



Дэлегат зьезду ІОФФЭ—колгас „Ботвін“ Слуцкага р-ну

На ранішнім паседжаньні 21-III зьезд заслухаў даклад сэкратара ЦК КП(б)Б, тав. Шаранговіча, аб міжнародным становішчы і задачах соц. будаўніцтва.

—Калі параўнаць становішча капіталістычнага сьвету з Савецкім Саюзам,—гаворыць т. Шаранговіч—дык нельга ня бачыць, як хутка мы расьцем, якімі магутнымі тэмпамі праходзіць будаўніцтва пяцігодкі ў 4 гады.

Безнадзейна хвораму дактары раяць упэўніваць сябе ў тым, што ты зусім здаровы. Гэта дапамагае. Хворы робіцца больш упэўненым. Капіталістыя карыстаюцца гэтым мэдычным сродкам. Яны гінуць у хвалях крызісу і крычаць аб тым, што крызіс выпадковы, часовы.

Мільёны пролетараў працуюць у нечалавечых умовах жудаснай эксплёатацыі, мільёны беспрацоўных скуты кайданамі жудаснага зьдзеку і голаду.

Далей тав. Шаранговіч спыняецца на тых вялікіх процэсах, якія адбываюцца ў Савецкім Саюзе.

— У справе соцыялістычнай перабудовы вёскі мы дасягнулі значных посьпехаў. Ад таго як мы будзем працаваць у колгасе, ад таго як мы здолеем выканаць ускладзеныя на нас задачы, у значнай частцы залежыць і тэмп далейшага росту колгасаў.

Сёньня конфэрэнцыя маладых будаўнікоў

Конфэрэнцыя баявой праверкі

Сёньня пачынае сваю працу Менская агульна-гарадзкая конфэрэнцыя маладых будаўнікоў. Асноўная мэта конфэрэнцыі —высьветліць стан падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону, разгарнуць паход за тэхніку на будаўніцтве, скарыстаўшы мэтод соцспаборніцтва ва ўсіх яго формах.

Высунутая „Чырвонай Зьменай“ прапанова разгарнуць вытворчыя манэўры на будаўніцтве, як адну з вышэйшых форм соцыялістычнага спаборніцтва, конкрэтна выявілася ў працы комсамольскіх колектываў. На дзьвёх пабудовах Белдзяржбудаб'яднаньня — абутковай фабрыкі і Дому ДПУ—абвешчаны манэўры. У выніку манэўраў організаваны плянава-опэрацыйныя групы, выпрацоўваюцца пляны работ на кожны дзень і для кожнай брыгады, організаваны кантрольныя дошкі, дзе асьвятляецца ход манэўраў.

Прапанова „Чырвонай Зьмены“ была падхоплена адразу. Конкрэтнае правядзеньне ў жыцьцё гэтай справы забясьпечыць пасьпяховую падрыхтоўку да будаўніцтва.

Асаблівую ролю адыгрываюць вытворчыя манэўры на старых об'ектах. Тут стаіць задача—здаць своечасова пабудовы ў карыстаньне з тым, каб можна было пачаць будаўніцтва новых об'ектаў.

Конфэрэнцыя будаўнікоў павінна будзе намеціць далейшыя шляхі па разгортваньню манэўраў на будаўніцтве, каб вопыт соцыялістычнага спаборніцтва знайшоў тут як мага большае прымяненьне. Конфэрэнцыя павінна сказаць сваё слова па пытаньню стандартызацыі будаўніцтва і разгортваньні далейшай работы па аўладаньню тэхнікай.

Адначасова з гэтым, неабходна будзе праверыць становішча падрыхтоўкі кадраў для будаўніцтва, а таксама ход зімовага набору ў будвучы.

Конфэрэнцыя будаўнічай моладзі вытворчая трывога баявой гатоўнасьці да сэзону. Гэта трывога павінна даць моцны штуршок разгортваньню будаўнічага сэзону.

С. К.

Лятуноў—да адказнасьці

Некаторыя пабудовы Белбудкантары ня могуць разгарнуць працу, бо не хапае тэхнічных кадраў.

Надзвычайна балюча адбіваецца на будаўніцтва лятунства некаторых тэхнічных працаўнікоў. Так, напрыклад комсамольцы Ізраіцель і Казлоўская былі закантрактаваны за Белбудкантарай. Скончыўшы тэхнікум, яны паступілі ў іншыя будаўнічыя канторы. Гэтым самым яны зрываюць будаўнічую работу.

Б.

Памножыць пачын комсамолу Менорганізацыі

ПРАВЕРЫМ СВАЮ ГАТОЎНАСЬЦЬ ДА СЯЎБЫ

Пачын Менскага гаркома, які абвясьціў пяцідзёнку праверкі сваёй падрыхтаванасьці, праз пробныя выезды ў поля, павінен быць падхоплен усёй Беларускай комсамольскай організацыяй

Пробным выездам у поля—дамагчыся організацыі соцен новых колгасаў і тысяч новых колгасьнікаў—баявая задача ленінскага комсамолу

ВЫХОДЗІМ НА ГЕНЭРАЛЬНУЮ ПРАВЕРКУ

Пастанова бюро Менгаркому ЛКСМБ аб організацыі пробнага выезду ў поле.

З мэтай зрабіць генэральную праверку ступені падрыхтаванасьці саўгасаў і колгасаў Менскага раёну да вясновай сяўбы, бюро Гаркому ЛКСМБ пастанаўляе:

1. Організаваць і правесьці з 25-III па 1-IV ва ўсіх колгасах і саўгасаў раёну пробны выезд ў поле.

2. Ячэйка КСМ савгасаў і колгасаў павінны зараз-жа разгарнуць масава-растлумачальную працу вакол гэтага важнейшага палітычнага мерапрыемства.

У час падрыхтоўкі і правядзеньня пробнага выезду **шырока популярызаваць сярод колгасьнікаў, рабочых саўгасаў, беднякоў і серадлякоў аднаасобнікаў тэзісы і даклад т. Якаўлева на 6-м зьезьдзе саветаў, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на пытаньні організацыі працы ў колгасах** (*зьдзельшчына, уздым вытворчасьці працы ў колгасах, барацьба з ядоцкай сыстэмай і г. д.*).

3. Час які застаўся да пробнага выезду ў поле, скарыстаць для таго, каб уся падрыхтоўчая праца да засеву была скончана, а менавіта: організаваны новы прыліў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у колгасы, складзены насенныя, страхавыя і кармовыя фонды, ачышчана насеньне, адрамантаваны сельска-гаспадарчы інвэнтар, даведзен плян вясеньняй сяўбы і кантрактацыі яравога пасеву да кожнага рабочага саўгасу і колгасьніка і шырока популярызаваны вытворчыя пляны саўгасаў і колгасаў. Адначасова бюро РК завастрае ўвагу ячэек на разгортваньне працы па падрыхтоўцы і праверцы падрыхтаванасьці да сяўбы аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

4. Па ўсіх хатах-чытальнях і ленкутках правесьці масавыя адкрытыя сходы комсамольскіх ячэек сумесна з беспартыйнымі колгасьнікамі і рабочымі саўгасаў, на якіх заслухаць справаздачы старшынь праўленьняў колгасаў і загадчыкаў саўгасаў аб падрыхтаванасьці да сяўбы.

5. Падрыхтоўку і правядзеньне пробнага выезду выкарыстаць для шырокага разгортваньня соц. спаборніцтва і ўдарніцтва паміж колгасамі, саўгасамі і ўнутры іх, забясьпечаўшы 100-процантны ахоп комсамольцаў і моладзі ўдарнымі брыгадамі і соц. спаборніцтвам.

Шырока популярызаваць **выступленьне т. Сталіна, пастанову ЦК УсеЛКСМ, мерапрыемствы „Чырвонай Зьмены" і гаркому ЛКСМБ аб паходзе комсамолу за тэхніку, распрацаваўшы конкрэтныя мерапрыемствы па ўключэньню саўгасаў і колгасаў у паход за агро-тэхніку.**

6. Скарыстаць гэты выезд сярод колгасьнікаў і аднаасобнікаў беднякоў і серадлякоў, як шырокую масава-палітычную кампанію, забясьпечыўшы гэтым самым новы масавы прыліў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у колгасы. Скарыстаць узрастаючую палітычную актыўнасьць моладзі для масавага росту саўгасных і колгасных ячэек за лік батракоў, рабочых саўгасаў і колгасьнікаў.

Даручыць оргаддзелу мобілізаваць з гарадзкіх комсамольцаў брыгады, якія накіраваць у вясковыя ячэйкі, каб дапамагчы ім пасьпяхова правесьці гэтае мерапрыемства

З БЛЕК-НОТУ БРЫГАДЗІРА

(б. Лупалаўскі раён—Магілеўшчына)

Брыгада, якая праверыла ход падрыхтоўкі да пасеўкампаніі ў былым Лупалаўскім раёне, выявіла, што большасьць колгасаў і саўгасаў да сяўбы не гатовы. Рад колгасаў яшчэ не аформіў і не правёў зямляўпарадкаваньня, не ссыпаў насенныя фонды, не абагуліў цяглавую сілу і мёртвы інвэнтар.

Пляны пашыраньня пасеўнай плошчы даведзены да колгасаў толькі на 55 проц., а да аднаасобнага сэктару—на 35.

Насенныя фонды ў колгасах складзены на 40 проц., страхавыя—на 23,2 проц.

Плян ачысткі насеньня выканан: колгасамі на 32 проц. і аднаасобным сэктарам—на 12 проц.

Плян рамонту сельска-гаспадарчых машын (трактары, плугі і інш.) выкананы ўсяго на 40 проц.

Пляны кантрактацыі і складаньне кантрактацыйных дагавароў на ярывы пасеў не даведзены да колгасаў і вёсак.

Няма сталай масавай працы з батрацтвам і беднатой. Наасобныя сельсаветы (Ждапаўскі, Кароўчынскі, Чарнікоўскі і інш.) палітычна недаацэньваюць працу з беднатай і працу па падрыхтоўцы аднаасобнага сэктару да вясеньняй сяўбы. Кіраўніцтва гэтых сельсаветаў разважае так: „Навошта нам праводзіць працу з аднаасобным сэктарам? Няхай рыхтуюцца самі. Наша справа малая". У выніку гэтых апортуністычных разважаньняў і практыкі—усім ніячным прыліў беднаты і серадняцтва ў колгасы былога Лупалаўскага раёну і асабліва гэтых сельсаветаў.

Таксама партыйна-комсамольскія ячэйкі гэтых сельсаветаў не мобілізавалі ўвагі мас батрацтва, беднаты і серадняцтва на ўдарную падрыхтоўку і правядзеньне вясеньняй пасеўкампаніі. Разважаючы, што „вясна яшчэ далёка, пасьпеем", партыйна-комсамольскія ячэйкі не пераключылі сваю працу на ўдарныя рэйкі.

У большасьці колгасаў не хапае корму. Комуна імя XVI партыйнага зьезду ня мае грубога корму. Больш 150 галовам буйнай рагатай жывёлы пагражае голад. Колгас ужо пачаў скармліваць насенны матар'ял, якога і без таго хопіць толькі на 50 проц. пасеўплошчы. Супроць падобных фактаў ніхто не змагаецца.

Зараз, у сувязі з раэгранізацыяй Лупалаўскага раёну, праца на падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай вясны зусім спынілася. Адчуваецца паўнейшае зацішша.

Раёны, да якіх адносяцца сельсаветы былога Лупалаўскага раёну, асабліва Дрыбінскі, павінны прыняць тэрміновыя захады, каб узьняць тэмпы падрыхтоўкі да вясеньняй сяўбы і аформіць організаваныя тры месяцы таму назад колгасы „Праўда" і „Вольная Праца".

Прыняць меры, каб поўнасьцю забясьпечыць колгасы кармамі, дзеля чаго выканаць плян загатоўкі фуражу (сена, саломы і інш.).

Партыйна-комсамольскія ячэйкі павінны мобілізаваць шырокія масы колгасьнікаў, беднякоў і серадлякоў на лепшую падрыхтоўку і правядзеньне вясеньняй сяўбы, на рашучую барацьбу з кулацтвам, праваапортуністычнай практыкай і стыхійнай на самацёк у падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы, разгарнуць масавую працу па ўцягненьню бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у колгасы і 100-процантнаму выкананьню плянаў кантрактацыі яравога пасеву.

Брыгадзір С. Саўрэй.

На доўга зазімаваўся

„Вясна яшчэ далёка...—пасьпеем"

РАБОТА ВЯДЗЕЦЦА ЎДАРНЫМІ БРЫГАДАМІ

БЯГОМЛЯ.—Нэдэльская комсамольская ячэйка абвясьціла сябе ўдарнай для правядзеньня другой бальшавіцкай вясны. Ячэйка організавала больш 5 ударных брыгад.

Дзьве брыгады, якія працуюць па ачыстцы насеньня, выканалі плян ачысткі на 100 проц. у колгасах і на 68 проц. у аднаасобным сэктары.

Брыгада па рамонту сельска-гаспадарчых машын выканала плян па рамонту сельскагаспадарчых машын. Ячэйка склала брыгаду па рамонту конскай збруі.

У выніку ўдарнай работы камсамольскіх брыгад, за апошнія дні ў колгасы ўступіла 15 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Брыгады працуюць мэтадам соц. спаборніцтва і ўдарніцтва. Нэдэльская ячэйка выклікала на соц.спаборніцтва па лепшаму правядзеньню і падрыхтаўцы да другой бальшавіцкай вясны комсамольскую ячэйку савгасу „Беларусь".

Я. Бабіцкі

БЫЦЬ УДАРНІКАМІ Ў ПОЛІТВУЧОБЕ

Ня гледзячы на значныя зрухі ў разгортваньні політвучобы (увядзеньне актыўных форм і мэтодаў, рэорганізацыя сеткі комполітвучобы і інш.), усё-ж у комсамольскіх організацыях яшчэ шмат буйных недахопаў.

Політшколы комсамольскага актыву, школы навічкоў, політгурткі і гурткі бягучай політыкі недастаткова мобілізуюць масы комсамольцаў і беспартыйную моладзь на вырашэньне бягучых політычных гаспадарчых і культурных задач.

У політвучобе яшчэ няма тае опэрацыйнасьці, якое дасягнуў комсамол у галіне гаспадарчага будаўніцтва. Мы маем шмат вопыту і добрых пачаткаў па разгортваньню політвучобы ў перадавых комсамольскіх організацыях, але яны слаба пераносяцца ў іншыя організацыі.

Ня гледзячы на рашэньні ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб палепшаньні політвучобы ў комсамоле, райкомы партыі і комсамолу слаба кіруюць гэтай справай.

Надалей разгортваньне політвучобы ў комсамоле павінна быць шчыльна ўвязана з праходзячымі гаспадарча-політычнымі зрухамі.

Даць адпор апартуністым, якія зрываюць політвучобу

Політадукацыя ў комсамольскіх ячэйках м. Дрыса (местачковая і ільназаводзкая) пастаўлена вельмі дрэнна.

З організаваных увосень дзьвёх школ працуе больш-менш здавальняюча адна вячэрняя савпартшкола, але і яе наведваюць усяго толькі 5 комсамольцаў. Другая—комсамольская політшкола за ўвесь час існаваньня не правяла ніводных заняткаў. Гурток па вывучэньню статуту і програмы ЛКСМБ і гурток бягучай політыкі спыніў сваю працу.

З боку партыйных ячэек няма належнага кіраўніцтва і дапамогі ў разгортваньні комсамольскай політвучобы. Надварот,—дапушчаецца зрыў. Напрыклад, да кіраўніка школы комсамольскай політвучобы, члена партыі Крылова, які ніколі не зьяўляўся і не зьяўляецца на заняткі, партячэйка ня прымае ніякіх мер.

Комсамольцы і беспартыйная моладзь, якія працуюць на ільназавадзе, ня могуць наведваць гурткі і школу комсамольскай політвучобы, Адміністрацыя заводу ня лічыць патрэбным урэгуляваць пытаньне з зьменамі ў працы. Аб гэтым перад адміністрацыяй тры тыдні таму назад ставілася пытаньне. Партколектыў і бюро комсамольскага колектыву права-апортуністычна адносіцца да таго, каб узьняць політузровень ў комсамольскай організацыі і сярод рабочай моладзі, а таксама да ліквідацыі няпісьменнасьці, якая ў значнай меры мае месца сярод рабочых ільназаводу.

На права-опортуністычныя адносіны да політвучобы ў комсамольскіх організацыях м. Дрыса і на ільназаводу райкомы КП(б)Б і ЛКСМБ не зьвяртаюць ніякай увагі. Яшчэ на сёньня рэйком комсамолу ня даў заданьняў ячэйкам па распаўсюджваньню 6-томніка твораў Леніна, па аўладаньню марксысцка-ленінскай тэорыяй.

Поот „ЧЗ"—Я. і Ц.

Кіраўніцтва няма

Ня гледзячы на пастанову X зьезду ЛКСМБ і IX УсеЛКСМБ аб ліквідацыі політнявісьменнасьці комсамол ў 6-месячны тэрмін, Касьцюковіцкі райком комсамолу ў гэтым напрамку яшчэ нічога не зрабіў. Райком ня даў яшчэ паказаньняў у ячэйкі аб організацыі політгурткоў, аб тым, каб увязваць іх работу з агульна-політычнымі задачамі, якія зараз пастаўлены перад комсамолам. Ніводная ячэйка яшчэ на сёньня не атрымала літаратуры, па якой комсамольцы змаглі-б павышаць свой політузровень.

А. Я.

Выгнаць з комсамолу

Спачатку зімовага пэрыоду політвучоба ў Тальскай комсамольскай ячэйцы (Любаньскі раён) пачынала разгортвацца. Былі створаны гурткі бягучай політыкі, якімі былі ахоплены амаль усе комсамольцы. Але, з прычыны дрэннага кіраўніцтва гурткамі, апошнія не змаглі разгарнуць сваю работу. Райком ЛКСМБ на гэта не зьвярнуў увагі. Акрамя опортуністычных адносін да кіраўніцтва політвучобай, зьявілася некалькі комсамольцаў, якія імкнуліся сарваць політвучобу, „Нам політвучоба не патрэбна. Для чаго нам вывучаць рашэньні зьездаў комсамолу і партыі",—так заявілі комсамольцы: Каратчэня Гаўрыла, Сянчэня Янка і Кошка Сяргей. Гэтыя комсамольцы замест таго, каб пайсьці на політгурток, ідуць на вячорку і займаюцца п'янкамі.

Баброўскі.

НЯ СПЫНІЦЬ МАГУТНАЙ ХВАЛІ САМАКРЫТЫКІ

Дукорская справа—клясычны прыклад опортуністычнай практыкі, заціску самакрытыкі, цкаваньня юнкораў і нерэагаваньня на сыгналы друку

Сьмілавіцкая організацыя комсамолу павінна стаць баявым отрадам Ленінскага комсамолу Беларусі

Ціха і спакойна ў Сьмілавіцкім раёне. У Дукорскім сельсавеце таксама спакойна і ціха. Чаго сьпяшацца? Куды гнацца?

Ды і сапраўды. Што дукарчанам да таго, што па Савецкім Саюзе адбываецца масавы прыліў у колгасы і колектывізацыя ў сярэднем дасягнула 35 проц., што на падставе разгортваньня соцыялістычных мэтодаў працы і барацьбы за лінію партыі растуць новыя колгасы, пасьпяхова праводзяцца важнейшыя гаспадарча-палітычныя кампаніі. Што дукорчанам да таго, што ў абвостранай клясавай барацьбе расьце новая колгасная вёска, карэнным чынам зьмяняецца твар краіны.

Аб чым гавораць проценты?

Вы кажаце—клясавы вораг? У Дукорах яго, здаецца, зусім няма. Ды і ня можа быць. Які там клясавы—вораг, калі сэкратар сельскай партыйнай ячэйкі, загадчык пошты Крэпскі кажа:

— Былыя жандары ў колгасе працуюць добрэсумленна... А між тым па сельсавеце колектывізацыя дасягнула ўсяго 9 проц., галоўныя гаспадарча-політычныя кампаніі правалены, у сельсавеце пераважную сілу маюць кулакі, ільназагатоўкі выкананы ўсяго на 25 проц. У колгасы прыняты ўсяго толькі дзьве гаспадаркі...—былога жандара і яго сваяка.

Партыйнае кіраўніцтва аддалося ў рукі кулаку і здала ўсялякія позыцыі.

Толькі тут пад дахам згніўшага мяшчанскага дабрабыту, пад кіраўніцтвам такой ячэйкі, дзе на чале стаяў былы дваранін Крэпскі, магла зусім сьцерціся клясавая барацьба, маглі выявіцца зусім яскравыя перапле́ты правай практыкі з „левымі“ справамі, мог выгадавацца тэрмін „савецкі кулак“ і маглі быць даведзены цьвёрдыя заданьні да серадняцкіх і нават бядняцкіх гаспадарак!

Толькі клясчыная опортуністычная практыка магла давесьці да такога становішча колектывізацыю і ўсе важнейшыя гаспадарча-політычныя мерапрыемствы партыі.

Шыльда для заціску

19-га студзеня гэтага году, у газэце „Чырвоная З мена“ № 15, была зьмешчана заметка пад назвай: „Ці могуць яны быць юнкорамі?“. У гэтай заметцы даводзілася, што юнкоры Піскун і Лявіцкі—вучні 7-й клясы Дукорскай ШКМ—ілжэ юнкоры.

У гэтай заметцы, пастаўленай на абгаварэньне чытачоў, прыводзіўся рад некомсамольскіх, ня юнкораўскіх учынкаў Піскуна і Лявіцкага. У адказ на гэтую заметку рэдакцыя атрымала 76 водгукаў ды і сапраўды!

Актыўныя юнкоры, людзі якія вельмі багата пісалі, выкрываючы сваім вострым пяром недахопы і паказваючы дасягненьні ў працы, апынуліся на лаве падсудных перад судом усёй нашай грамадзкасьці.

Зьмяшчэньне заметкі: „Ці могуць яны быць юнкорамі“ разбудзіла дукорскую ціш. Стала раптам шумна. Нават занадта шумна. Сэкратар сельсавету, Шыдлоўскі, таксама як і выкладчык грамадазнаўства, Чарноў, насіліся з газэтай і сьвяткавалі вялікую ўрачыстасьць:

— Нічога... Папаліся! Гэта толькі пачатак... Канец яшчэ будзе.

А далей падзеі разгортваліся з кінэматографічнай хуткасьцю.

Сьвяткавалі перамогу

Адразу-ж Лявіцкага выводзяць з гуртка рабселькораў, які ён організаваў, здымаюць з грамадзкай працы ў школе, з працы ў насьценгазэце і ставіцца на комсамольскай ячэйцы пытаньне аб выключэньні яго з комсамолу...

Ці ня праўда хутка? Куды падзеліся тая цішыня, спакой і нярухомасьць, куды дзеўся мерны дабрабыт дукарчан?

Зьмешчаны на абгаварэньне ў газэце матар'ял паслужыў шыльдай закрываючыся якою, людзі розных колераў і думак пачалі зводзіць свае асабістыя разрахункі.

Гэта пад напорам Чарнова Лявіцкі выключаецца з гуртка і здымаецца з грамадзкай працы. Гэта пад яго напорам Лявіцкі быў прымушаны адмовіцца ад сваёй крытыкі і даць аб гэтым пісьмовую даведку, бо нельга „компромэнтаваць аўторытэтных партыйцаў.“

Гэта па дырэктыве Апа райкому Малкіна яго выключаюць з комсамолу і „даручаюць тав. Сароку падабраць адпавядаючы рашэньню матар'ял,“ гэта дзякуючы сэкратару партыйнай ячэйкі не допускаюцца тэлефонныя перамовы юнкораў з



Дукоро і опортуністы: „.. кулак працуе дабрасумлена“

Менскам, праводзіцца самы махровы заціск.

Юнкоры Лявіцкі і Піскун былі аднымі з тых многіх, хто бачыць недахопы і жадае змагацца з імі, хто піша і піша вельмі многа. Іхныя допісы вельмі часта зьмяшчаліся, надзвычайна багата паслана на рэагаваньне.

Махнулі рукой

На зьмешчаныя допісы не рэагавалі. Як-жа маглі рэагаваць, калі сэкратар ячэйкі комсамолу—Рэдзька кажа:

— Каб даваць абвяржэньні (!?) трэба кожны дзень пісаць... Мы махнулі рукой і сказалі: пішы сабе... Звыш 200 допісаў, пасланых толькі рэдакцыяй „Савецкай Беларусі“ на рэагаваньне, засталіся без адказу. Якое можа быць рэагаваньне калі член РКК РСІ—Іваноў—кажа, што адказваць на ўсе допісы—лішняя пісаніна...

З усяго гэтага выплывае пытаньне:—дзе было і чым займалася раённае кіраўніцтва? Што яно рабіла і як кіравала рабселькораўскім, юнкораўскім рухам?

Рабселькораўскі рух узьнік стыхійна, без усякага кіраўніцтва і дапамогі, юнкоры організаваліся ў гуртку, але гурткі беспартыйныя, бо партыйнага, альбо комсамольскага кіраўніцтва там не было.

Калі ўзьнялося гэта пытаньне, РК КП(б)Б вылучыў камісію для абсьледаваньня становішча Дукорскай організацыі. Але РК з вывадамі камісіі не згаджаецца.

— „Во як-жа так?—кажа сэкратар РК—тав. Стром.—Прагледжаны 200 допісаў і ня зьвераны з жыцьцём... Ды так можна палічыць іх усе правільнымі“.

РК дапусьціў яўнае прымірэнцтва да гэтага махровага заціску самакрытыкі, доўгі час пакідаючы на працы сэкратара партыйнай ячэйкі, чалавека, асуджанага на 6 месяцаў прымусовай працы за тое, што ўскрываў адрасаваныя на расьсьледваньне лісты.

На сходзе, дзе камісія РК паведамляла аб папярэдніх выніках абсьледаваньня, выявілася, што „нашы Дукоры шырокі і раскошны, але парадку ў іх няма“.

Становішча Дукорскай організацыі патрабуе, каб былі зроблены адпаведныя політычныя і організацыйныя вынікі.

Іх павінна будзе ў бліжэйшы час зрабіць ЦКК РСІ.

Клясавага твару ня было

Сумны вопыт Дукорскай практыкі зьяўляецца прыкладам ігнараваньня працы з беднатой, змазваньня ўсялякай клясавай барацьбы і здачы бальшавіцкіх позыцый.

Гэта справа паказала, што ў Дукорах ня відаць твару комсамольскай організацыі. Організаваны колгас імя X зьезду ЛКСМБ амаль разваліўся. Ніякага ўдзелу ў гаспадарча-політычным жыцьці комсамольская організацыя ня прымала. Частыя зьмены сэкратароў, замкнутая организацыйная праца давялі да таго, што ў організацыі ня было ніякага росту.

Юнкоры Піскун і Лявіцкі, ня меўшы, як і многія другія, сталага кіраўніцтва і дапамогі, засталіся тымі-ж юнкорамі, якімі яны былі некалькі год раней. Яны адсталі ад агульных тэмпаў росту, яны засталіся фотографамі і летапісцамі а ня творцамі і організатарамі бальшавіцкіх спраў.

Яны пісалі шмат і пісалі правільна. Але не паказвалі на практыцы, у жыцьці, як змагацца з недахопамі і перамагаць іх, як дабівацца найлепшых вынікаў.

Патрэбны адпаведныя вывады

Не ўсьвядоміўшы ролі і важнасьці юнкара як ударніка, яны мала працавалі ў комсамольскай організацыі, не зьяўляліся жывым прыкладам ударнасьці. Карыстаючыся паасобнымі недахопамі юнкораў, заціскачы наступалі на самакрытыку.

Дукорскі вопыт паказвае, што нам патрэбен ня толькі юнкор—актыўны корэспондэнт, але юнкор—актыўны барацьбіт, ударнік, ударнік на кожным вучастку працы, дзе-б ён ні знаходзіўся.

Дукорская справа сыгналізуе аб слабым кіраўніцтве юнкораўскім рухам, аб наяўнасьці політычных прарываў у Сьмілавіцкай організацыі комсамолу.

ЦК ЛКСМБ павінен правесьці агляд дзейнасьці Сьмілавіцкай і ў прыватнасьці Дукорскай організацыі з тым, каб, вызваліўшыся ад носьбітаў правай практыкі, аздаравіць організацыю.

Л. Глезэр

Соцыялізм—гэта плян

Дзяржпляну БССР—10 год

РАЗГОРТВАЮЧЫ ПЛЯНАВА-ОПЭРАЦЫЙНЫ РУХ—МАЦАВАЦЬ ОРГАНЫ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ПЛЯНАВАНЬНЯ

Дэкада штурму вышынь плянаваньня

(З пастановы Менгаркому ЛКСМБ)

10-годзьдзе Дзяржпляну БССР павінна зьявіцца аглядам усёй сыстэмы плянавай работы, аглядам набліжэньня комсамольскай організацыі да задач плянаваньня.

У сувязі з гэтым, бюро гаркому пастанаўляе:

У дзень сьвята 10-годзьдзя Дзяржпляну абвясьціць пачатак дэкады агляду вытворчай работы ўсёй Менскай комсамольскай організацыі, наколькі яна павярнулася тварам да плянаваньня.

22 сакавіка правесьці на прадпрыемствах мітынгі аб 10-годзьдзі Дзяржпляну, аб чыстцы плянавага апарату і задачах, якія стаяць перад плянава-опэрацыйнымі групамі.

Дзень 10-годзьдзя Дзяржпляну ператварыць у дзень паходу за уздым новай хвалі організацыі плянава-опэрацыйных груп імя X-годзьдзя Дзяржпляну.

Ухваліць мерапрыемствы, якія намечаны колектывам ЛКСМБ Дзяржпляну ў галіне дапамогі і кіраўніцтва плянава-опэрацыйнымі групамі менскіх прадпрыемстваў,

У сувязі з чысткай Дзяржпляну лічыць неабходным:

Поўнасьцю рэалізаваць рэшэньні бюро Гаркомеў КП(б)Б і ЛКСМБ аб мобілізацыі 20 комсамольцаў у апарат Дзяржпляну, прапанаваўшы оргаддзелу у трох дзенны тэрмін скончыць гэтую работу.

Ухваліць мерапрыемствы колектываў ЛКСМБ друкарні імя Сталіна і Дзяржпляну па ўдзелу іх у чыстцы апарату. Лічыць мэтазгодным вынесьці чыстку оргсэктару Дзяржпляну, якую праводзіць „лёгкая кавалерыя“, на агульна-гарадзкі зьлёт „ЛК“.

ЛК на пераломе

Ячэйка ЛКСМБ Дзяржпляну, распачала ўзмоцненую падрыхтоўку да праведзеньня чысткі і пабудовы апаратаў ў сапраўдны штаб плянаваньня соцыялістычнага будаўніцтва.

Група „ЛК“ Дзяржпляну, сумесна з групай „ЛК“ свайго шэфа—друкарні імя Сталіна стварыла ў кожным сэктары баявыя пасты з комсамольцаў і беспартыйнай моладзі з тым, каб пабаявому праводзіць падрыхтоўчую работу камісіі па чыстцы і зборы адпаведнага матар'ялу.

Зараз вывучае работу оргсэктару спэцыяльная брыгада групы „ЛК“ з 10 таварышоў, складзеная з моладзі друкарні імя Сталіна і ячэйкі Дзяржпляну.

Пастаўленыя перад групай „ЛК“ Дзяржпляну задачы патрабуюць з максымальнай увагай і бальшавіцкай адданасьцю правесьці праверку і чыстку з тым, каб гэты вопыт пашырыць і ўжыць у радзе іншых устаноў.

А.

ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ

10 год мінулі з дня нараджэньня Дзяржпляну. 10 год слаўнай барацьбы за соцыялістычнае будаўніцтва, за перамогу комуністычных ідэй, ператворных у жыцьцё пролетарыятам Савецкага Саюзу.

Дзяржплян быў утвораны ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, ва ўмовах, калі клясава-варожыя элементы абнадзеяныя ўвядзеньнем новай экономічнай політыкі спадзяваліся на перараджэньня соцыялістычнай сыстэмы.

Дзяржплян быў заклікан плянаваць наша соцыялістычнае разьвіцьцё.

Вораг добра зразумеў выключнае кіраўнічае і організуючае значэньне плянавай сыстэмы. Ён пранік на ее каманлныя вышыні, і хацеў скарыстаць соцыялістычную плянавую сыстэму, каб павярнуць наша разьвіцьцё на капіталістычны шлях.

Аднак, уздым творчай энэргіі мільёнаў працоўных абярнуў усе проэктаваньні шкоднікаў. Рука пролетарыяту вырвала ганебную старонку з кнігі перамог на фронце плянавага соцыялістычнага будаўніцтва.

Зараз, калі ў прамысловасьці вырашана пытаньне „Хто-каго“, на карысьць сацыялізму, калі пытаньне „Хто-каго“ ў сельскай гаспадарцы ўжо ў значнай меры разьвязана роля плянаваньня нашага соцыялістычнага будаўніцтва набывае яшчэ большае значэньне.

Організаваць ініцыятыву і энэргію мільёнаў на тое, каб яшчэ больш паскорыць нябачаныя тэмпы нашага соцыялістычнага будаўніцтва—вось задача, якая стаіць сёньня перад плянавай сыстэмай.

Гэтая задача вырашаецца ў першую чаргу набліжэньнем плянавай сыстэмы да вытворчасьці, уключэньнем у сыстэму плянаваньня новай арміі плянавікаў—арміі заводзкіх, колгасных, саўгасных, комсамольскіх плянава-опэрацыйных груп.

Высунуты т. Сталіным—лёзунг павярнуцца тварам да тэхнікі—для плянаваньня ў першую чаргу азначае; прыцягнуць лепшых вытворчых ударнікаў, якія ведаюць тэхніку сваёй вытворчасьці і аб'яднаны ў плянава-опэрацыйныя групы, да работы па складаньню і праверцы выкананьня пляну.

Дзяржпляну яшчэ вельмі мала зрабіў для таго, каб наблізіць апарат плянаваньня да вытворчасьці. Дзяржплян яшчэ вельмі мала зрабіў для кіраўніцтва работай плянава-опэрацыйных груп. Дзень дзесяцігодзьдзя павінен стаць пераломным днём у кіраўніцтва плянава-опэрацыйнага руху.

Комсамольскі калектыў Дзяржпляну павінен разгарнуць работу плянава-опэрацыйных груп ня толькі ў Менску, але і ва ўсёй БССР.

Трэба, каб самі вытворчыя колектывы ўдзялялі больш увагі рабоце плянава-опэрацыйных груп, каб яны наблізіліся да Дзяржпляну ў сваёй рабоце.

Ажыцьцяленьнем лёзунгу „ад варштата—да Дзяржпляну, ад Дзяржплану—да варштата“, мы забясьпечым яшчэ больш высокія тэмпы сацбудаўніцтва.

Разгорнуць масавую работу вакол юбілею

Пастанова

бюро ЦК ЛКСМБ аб правядзеньні 10-гадовага юбілею газэты „Чырвоная Зьмена“

1. ЦК ЛКСМБ надаючы вялікае політычнае значэньне 10-гадоваму юбілею газэты „Чырвоная Зьмена“, які адбудзіцца 25 красавіка 1931 г., лічыць,—што ён павінен прайсьці пад знакам падвядзеньня вынікаў работы газэты, як організатара шырокіх мас комсамольцаў, рабочай і працоўнай моладзі вакол генэральнай лініі партыі, за ажыцьцяўленьне задач соцыялістычнага будаўніцтва, яшчэ большага ўмацаваньня газэты і яе сувязі з масамі рабочай, колгаснай, батрацка-бядняцкай і серадняцкай моладзі.

Комсамольская організацыя павінна аддаць юбілею асаблівую ўвагу, стварыўшы вакол яго масавасьць, яшчэ больш мобілізаваўшы комсамольцаў і шырокія колы працоўнай моладзі навакол задач партыі і Саюзу, па-баявому ажыцьняўляючы рашэньні зьездаў КСМ.

2) Прапанаваць усім Гаркомам і райкомам разгарнуць масавую работу вакол юбілею, практычна дапамагчы газэце ажыцьцёвіць намечаныя мерапрыемствы ў зьвязку з 10-гадовым юбілеем, асабліва ў галіне гаспадарча-політычных задач, зрабіць газэту яшчэ больш баявой зброяй ЛКСМБ для мобілізацыі мас комсамольцаў, працоўнай моладзі на выкананьне задач соц. будаўніцтва. Пачынаньне газэты па перадачы вопыту лепшай работы зрабіць здабыткам усёй комсамольскай організацыі.

3) ЦК прапануе правесьці па ўсіх раёнах конфэрэнцыі чытачоў „Чырвонай Зьмены“, даручыць юбілейнай камісіі вызначыць групу раёнаў для правядзеньня райконфэрэнцый з дакладамі рэдакцыі „Чырвонай Зьмены“; у колектывах і ячэйках правесьці дыспуты і вечары, прысьвечаныя юбілею „Чырвонай Зьмены.

4) На працягу сакавіка і красавіка месяцаў правесьці праверку як выконваецца складзеная паміж рэдакцыямі, раённымі камітэтамі і ЛКСМБ соц. умова, дабіўшыся, каб кожны комсамолец чытаў і выпісваў „Чырвоную Зьмену“, каб газэта зьяўлялася настольным падручнікам у рабоце кожнай ячэйкі, кожнага комсамольца, дабіцца павялічэньня тыражу „Чырвонай Зьмены“ да 60000 экз.

5) Прапанаваць райкомам скарыстаць правядзеньне юбілею газэты для ўмацаваньня работы сярод юнкораў; даючы ім опэрацыйныя заданьні, уцягваць іх у актыўную штодзённую працу па ажыцьцяўленьню конкрэтных мерапрыемстваў газэты ў барацьбе за выкананьне задач партыі і Саюзу ў галіне соцыялістычнага будаўніцтва

6) Прапанаваць рэдакцыі разгарнуць праз газэту адпаведную масавую працу па мобілізацыі комсамольскай організацыі і працоўнае моладзі вакол юбілею „Чырвонай Зьмены“, сыстэматычна асьвятляючы падрыхтоўку праз газэту.

7) Абавязаць гаркомы і райкомы сыстэматычна інформаваць ЦК аб ходзе падрыхтоўкі да юбілею, заслухаўшы на бліжэйшым бюро ЦК справаздачы некаторых РК аб падрыхтоўцы да юбілею.

8) Практычны плян падрыхтоўкі да юбілею „Чырвонай Зьмены“ зацьвердзіць. Даручыць юбілейнай камісіі праводзіць опэрацыйнае кіраўніцтва падрыхтоўкай да юбілею „Ч. З.“.

„Я рос і выхоўваўся пры дапамозе „Чырвонай Зьмены“

Я рос і выхоўваўся пры дапамозе „Чырвонай Зьмены“. Яна мне давала і дае правільны напрамак у маёй штодзённай працы па ажыцьцяўленьню генэральнай лініі партыі, у выкананьні пяцігодкі за 4 гады.

Я люблю чытаць і распаўсюджваць сваю газэту.

„Чырвоная Зьмена“ сваю работу праводзіць на падставе жорсткай бальшавіцкай самакрытыкі, рашуча змагаючыся з усялякімі спробамі заціску яе.

„Чырвоная Зьмена“ павінна і надалей яшчэ з большай заўзятасьцю мобілізоўваць ленінскі комсамол і працоўную моладзь на ажыцьцяўленьне вялізарнейшых задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі, выхоўваць кадры энтузіястых соцыялістычнага будаўніцтва.

„Чырвоная Зьмена“ павінна змагацца за юнкора-ўдарніка і ўдарніка-юнкора.

Юнкор-ўдарнік
Міхась Ракіта

У падарунак юбіляру

Агульны сход вучняў Ратамскай 4-х комплектнай школы ўзяў на сябе абавязкі:

1. Дапамагчы колгасу „Кастрычнікавая Рэволюцыя“ па-ўдарнаму выйсьці ў поле.
2. Уцягнуць бацькоў аднаасобнікаў у колгасы.
3. Ліквідаваць няпісьменнасьць сярод бацькоў.

Абвешчаем сябе ўдарнікамі па выпісцы газэты „Чырвоная Зьмена“.

Вэта будзе падарункам юбіляру.

Грызун.

„Паказваць, як здабываць дасягненьні“

„Чырвоная Зьмена“ да свайго Х-гадовага юбілею прышла сапраўдным кіраўніком і організатарам шырокіх колаў працоўнай моладзі ў барацьбе за генэральную лінію партыі. Для яшчэ большай опэрацыйнасьці ў рабоце газэты, я прапаную:

Зьмяшчаючы матар'ялы аб працы колгасных і вясковых ячэек, трэба больш пісаць аб тым, якім шляхам здабыць тое ці іншае дасягненьне.

Для лепшага кіраўніцтва юнкоррухам выдаваць раз у дэкаду старочку юнкорбрыгад і памятку юнкора.

Сыстэматычна адводзіць на старонках „Чырвонай Зьмены“ куток—хто ідзе ўперадзе па падпісцы на „Чырвоную Зьмену“.

Юнкор М. Гузоўскі

Групы энтузіястых, даёш ударныя тэмпы

На фабрыцы „Кастрычнік“ працуе больш 500 чалавек моладзі. Комсамольскі колектыў складаецца з 320 чалавек

Але з выпіскай „Чырвонай Зьмены“ справа пастаўлена з рук вон кепска.

Заданьне выканана ўсяго на 17 проц. Бюро колектыву не зьвяртала ніякай увагі на распаўсюджваньне „Чырвонай Зьмены“.

Зараз ударная брыгада „Ч. З“. пачала складаць пры кожнай цэх ячэйцы групы энтузіястых па вербоўцы падпісчыкаў на „Ч. З.“ Такіх груп ужо створана дзьве (17 асоб). Групы абвясьцілі сябе ўдарнымі юнкораўскімі брыгадамі. Кожная брыгада ўзяла цьвёрдае конкрэтнае заданьне па выпісцы „Чырвонай Зьмены“ згодна заданьня колектыву. Мэта групы энтузіястых да 10-га юбілею „Чырвонай Зьмены“ перавыканаць заданьне па яе выпісцы.

Ударная брыгада „Чырвонай Зьмены“
Кавалевіч, Лешчанка

Саюзны сэктар павінен па-ўдарнаму працаваць

Добры пачын „Чырвонай Зьмены“—гэта організацыя рэйдаўскіх брыгад пры рэдакцыі. Юнкорам і жадаючым пісаць у газэту гэта дае магчымасьць згуртавацца вакол рэдакцыі.

Недахоп газэты ў тым, што ву[illegible] не адчуваецца сэктар. **Л. Ф.**

ПЛЯН БАРАЦЬБЫ НА КУЛЬТУРНЫМ ФРОНЦЕ

Усебеларуская культэстафэта—магутны вагар у выкананьні вялізарных задач культурнай рэволюцыі

Комсамолія, змагайся за ажыцьцяўленьне баявой програмы!

Маршруты Ўсебеларускай культэстафэты другога этапу*)

Маршрут № 3

За якасьць усеагульнага навучаньня на аснове політэхнізацыі

„Галоўнае зараз перайсьці на абавязковае першапачатковае навучаньне, я кажу; галоўнае, бо такі пераход азначаў-бы рашучы крок у справе культурнае рэволюцыі“ (Сталін).

1. Ўтварыць пэрсональную праверку ахопу школамі падлеглых усеагульнаму абавязковаму навучаньню, прыняўшы захады да ўцягненьня ў школы не ахопленых.

2. Увесьці на ўсіх школах гораду і вёскі гарачыя сьнеданьні, не паслабляць працы па забяспечаньні беднейшых вучняў абуткам і вопраткай. Патрэбныя для гэтай справы дадатковыя сродкі мобілізаваць на аснове разьвіцьця грамадзкасьці.

3. З мэтай рыхтаваньня да будаўніцтва гэтага сэзону безадкладна організаваць высечку і вывазку лесаматэрыялаў на пабудову школ, прадугледжаных плянам у гэтым годзе. Прыняць захады да будаўніцтва школ, распачатага ў мінулым годзе.

4. Ліквідаваць запазычанасьць грамадзкіх організацый у сродках на ўсеагульнае абавязковае навучаньне за асобны квартал, забясьпечыўшы выпачасова паступленьне сродкаў у гэтым годзе. Праверыць скарыстаньне фондаў не ўсеагульнае абавязковае навучаньне.

5. Правесьці агляд політэхнізацыі пад пунктам выяўленьня ўсіх недахопаў і станоўчых бакоў у гэтай рабоце. Організаваць майстэрні і пакоі пры найбольш буйных школах, неабходныя прылады і інструмэнты на аснове грамадзкасьці ... і пакоі набыць шляхам збору іх у бацькоў і грамадзкіх організацый. Працу па політэхнізацыі разгарнуць такімі тэмпамі каб ні адна школа не засталася без конкрэтнай работы ў гэтым напрамку. Тэарэтычную работу школы ўвязаць з практычнай работай вучняў на прадпрыемствах, саўгасах і колгасах.

6. Прыняць усе захады да падвышэньня якасьці работы школ шляхам наладжваньня плянавасьці ў рабоце школ, правядзеньня актыўных мэтодаў у выкладаньні: зьвярнуўшы пры гэтым асаблівую ўвагу на пастаноўкі інтэрнацыянальна-клясавага і антырэлігійнага выхаваньня.

7. Разгарнуць работу па ўцягненьні школ у соцспаборніцтва, а таксама па пашырэньні ўдарніцкага руху сярод вучняў. Работу па соцспаборніцтву і ўдарніцтву накіраваць на выкананьне колькасных і якасных паказчыкаў па ўсеагульнаму навучаньню.

8. Дабіцца каб кожная школа была організатарам агра-культурных мерапрыемстваў (ачыстка насеньня, пратручваньне, збор попелу і інш.) актыўным удзельнікам у рабоце пашырэньня пасеўнага кліну і калгаснага руху. Лёзунг: „Кожная школа—організуе калгас“ павінен быць выканан. Школы гораду, акрамя ўдзелу у правядзеньні другой бальшавіцкай сяўбы актыўна удзельнічаюць у выкананьні прамфінпляну.

Маршрут № 4

За аўладаньне тэхнікай

„Кажуць, што цяжка аўладаць тэхнікай,—няпраўда, няма такіх цытадэлей: якіх-бы бальшавікі не змаглі ўзяць“. (Сталін).

1. Шырока папулярызаваць прамову тавярыша Сталіна на Ўсесаюзнай нарадзе прамысловых працаўнікоў аб аўладаньні тэхнікай, мобілізуючы рабочых і саўгасныя масы на практычнае яе выкананьне.

2. Правесьці работу на ўсіх прадпрыемствах, саўгасах і колгасах за ўвязаньне мінімуму тэхнічных ведаў.

3. Організаваць пры ўсіх прадпрыемствах, саўгасах і колгасах тэхнічныя школы, выходзячы з задач аўладаньня процэсамі дадзенай вытворчасьці. Школы організаваць—першапачатковай кваліфікацыі, павышэньня кваліфікацыі і падрыхтоўкі майстраў і брыгадзіраў.

4. Правесьці ўцягненьне культасьветных сіл гораду і вёскі ў якасьці кіраўнікоў школ па аўладаньні тэхнікай.

5. У рабоце ўсіх культасьветных устаноў адвесьці належнае месца прапагандзе за аўладаньне тэхнікай.

6. Неабходныя сродкі на організацыю работы па аўладаньню тэхнікай (літаратура і інш.) вышукаць на аснове грамадзкасьці.

7. Увесьці на ўсіх фабрыках, заводах, саўгасах і колгасах спэцыяльны дзень „дзень за аўладаньне тэхнікай“, у гэты дзень павінны працаваць школы і гурткі па тэхніцы.

Вучні ШКМ колгасу імя Сталіна на практычных занятках

Маршрут № 5

За ўдарныя тэмпы ў падрыхтоўцы пролетарскіх кадраў

„Толькі пры далейшай мобілізацыі сіл усяе партыі і рабочае клясы навакол задач падрыхтоўкі кадраў з людзей рабочае клясы, толькі пры рашучым узросту ў гэтай галіне,—магчыма забясьпечыць далейшае правядзеньне бальшавіцкіх тэмпаў сацыялістычнай індустрыялізацыі краіны“ (з рэзол. 16-га зьезду ўсе КП(б).

1. Правесьці кампанію вясеньняга набору ў ФЗВ і на кароткатэрміновыя курсы па падрыхтоўцы адпаведных кадраў.

2. Забясьпечыць комплектаваньне пролетарскім кантынгентам ВНУ і тэхнікумаў пры вясеньнім наборы.

3. Шырока разгарнуць работу па соцспаборніцтву і ўдарніцтву ў навучальных установах, накіраваўшы гэту работу на павышэньне якасьці вучобы.

4. Разгарнуць работу па палепшаньні матар'яльнага забесьпячэньня студэнцтва, асабліва па палепшаньні якасьці харчаваньня.

5. Дабіцца сапраўдных бальшавіцкіх прыкладаў у рабоце студэнцкіх організацый па правядзеньні другой бальшавіцкай сяўбы. Організаваць масавыя выезды студэнтаў на вёску для актыўнага ўдзелу ў правядзеньні пасеўкампаніі і колектывізацыі, а таксама ў разгортваньні колгаснага руху.

Маршрут № 6

За масавае разгортваньне дашкольнага выхаваньня

1. Распрацаваць плян організацыі дашкольных летніх устаноў у кожным горадзе і раёне.

2. Правесьці мобілізацыю на аснове грамадзкасьці, неабходных сродкаў для гэтай мэты.

3. Выявіць і ўзяць на вучот памяшканьні, у якіх будзе організавана работа летніх дашкольных устаноў, правёўшы належнае іх абсьледваньне праз організацыю суботніка.

4. Правесьці вылучэньне кіраўнікоў дзіцячых устаноў з работніц і колгасьніц, прапусьціўшы іх праз кароткатэрміновыя курсы, якія організаваць на грамадзкія сродкі ў кожным горадзе і раёне.

5. Правесьці вучот дзяцей рабочых, колгасьнікаў і беднаты, якіх неабходна будзе прыняць у дашкольныя ўстановы і падрыхтоўцы да своечасовага адчыненьня іх.

6. Палепшыць работу існуючых дашкольных устаноў, шляхам умацаваньня матар'яльнай базы, забесьпячэньня іх неабходнымі продуктамі, а таксама пастаноўкай на належную вышыню выхаваўчай работы, правёўшы элемэнты політэхнізацыі. Работу дашкольных устаноў прыстасаваць да умоў работы прадпрыемстваў, саўгасаў і колгасаў.

Усебеларускі штаб культэстафэты.

*) Пачатак гл. ва ўчорашнім № „ЧЗ“

Паведамленьне

Пры Менскім Белпэдтэхнікуме праводзіцца новы набор слухачоў на 6-ці месячныя пэдагогічныя курсы.

Будзе залічана 100 асоб.

55 проц. залічаных, будзе атрымоўваць стыпэндыю.

Прыём заяў—да 3-га красавіка, пачатак заняткаў 5 красавіка.

Правілы прыёму—у даведніку Н. К. А. на 1930-31 г.

Заявы адрасаваць: Менск, Савецкая 107,—Беларускі Пэдагогічны Тэхнікум.

Адказны—рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599